ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА

УДК 947.07 (476)

КАРПІЕВІЧ ДЗМІТРЫЙ ВІКТАРАВІЧ

# СІСТЭМА ЎЗНАГАРОД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ І ЯЕ СУВЯЗЬ З САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫМІ ПРАЦЭСАМІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII СТАГОДДЗІ

07.00.02 – Айчынная гісторыя

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Бібліятэка
Даводачна-бібліяг...
аддзел

Віцебскі дз...
уні...
імя П.М. ...
БІБЛІЯТЭКА

Мінск - 1999

Б5.3(4Беі)6-6
К26

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар Люты А.М.

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Аржэхоўскі І.В.

кандыдат гістарычных навук Туміловіч Г.М.

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі універсітэт культуры

Абарона адбудзецца 24 верасня 1999 г. у 16.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 48[illegible], тэл. 268-79-91.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Аўтарэферат разасланы «20» жніўня 1999 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый — кандыдат педагагічных навук, дацэнт І.І.Багдановіч

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# 1
# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыі. Вывучэнне ўзнагарод з'яўляецца вельмі важным у разуменні сацыяльных і палітычных працэсаў, што адбываліся ў грамадстве і дзяржаве. Даследаванне ганаровых адзнак дазваляе больш дакладна раскрыць сутнасць пэўных механізмаў існавання дзяржаўнага ладу, бо выступае своеасаблівым індыкатарам яго. У гэтым сэнсе сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай выклікае вялікую цікавасць, таму што ў ёй адлюстроўваюцца не ўласцівыя краінам Еўропы XVI-XVIII стст. рысы палітычнага ладу, які набліжаўся да шляхецкай рэспублікі.

Вывучэнне розных маладаследаваных аспектаў сацыяльнай і палітычнай гісторыі Беларусі XVIII ст. мае на сучасным этапе вялікае значэнне для гістарычнай навукі. Гэта дазваляе вырашыць шэраг актуальных і значных праблем. Адна з іх – даследаванне сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай і яе сувязей з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі.

Дадзеная праблема знаходзіцца на перакрыжаванні ўласна гісторыі і фалерыстыкі – спецыяльнай дапаможнай гістарычнай дысцыпліны, якая вывучае гісторыю фарміравання і развіцця сістэм узнагарод па ганаровых адзнаках і звязаных з імі іншых крыніцам [1].

Па сённяшні дзень вывучэнне гісторыі сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай і яе сувязі з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі застаецца па-за ўвагай айчыннай гістарыяграфіі, што абумоўлена, на наш погляд, дзвюма галоўнымі прычынамі.

Па-першае, такое становішча тлумачыцца агульнай сітуацыяй ігнаравання на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў розных значных праблем сацыяльнай і палітычнай гісторыі Беларусі XVIII ст. Па-за ўвагай беларускіх гісторыкаў заставаліся важныя і складаныя пытанні таго часу. Так, амаль не даследавалася гісторыя беларускай шляхты, бо яна лічылася саслоўем «польскіх паноў». А сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай непарыўна звязана з гісторыяй шляхецтва.

Па-другое, фалерыстыка ў Беларусі на сённяшні дзень не атрымала дзейснага развіцця. Не існуе прац і артыкулаў, якія вызначылі б прадмет, мэты і задачы гэтай гістарычнай дысцыпліны, метады яе даследавання, увялі перыядызацыю фалерыстыкі і г. д. Тым больш не даводзіцца гаварыць і пра вывучэнне асобных этапаў існавання сістэм узнагарод на Беларусі.

[1] Бурков В.Г. Фалеристика.- Ленинград, 1985.- С. 10.

*20504183*

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Тэма даследавання прадстаўляецца актуальнай таму, што дазваляе раскрыць сутнасць феномена ўзнагарод і адносін да яго ў грамадстве на канкрэтным гістарычным прыкладзе.

Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Тэма дадзенага даследавання зацверджана на Вучоным савеце БДПУ імя Максіма Танка (пратакол № 5 ад 31.01.96 г.). Яна ўваходзіць у склад навуковай тэмы «Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларусі ў XVIII-XIX стст.», якую распрацоўвае кафедра гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта і каардынуе АН Рэспублікі Беларусь ( № ДР 19942101).

Мэта і задачы даследавання. Мэта працы – паказаць працэс фарміравання і развіцця дзяржаўнай сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай, раскрыць яе сувязі з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі ў XVIIIст.

Зыходзячы з мэты, вызначаны наступныя задачы даследавання:

- прааналізаваць сацыяльна-палітычныя ўмовы заснавання ганаровых адзнак Рэчы Паспалітай;
- разгледзець эвалюцыю працэса фарміравання сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай;
- паказаць ролю ганаровых адзнак як інструмента ўнутранай і знешняй палітыкі ўлад;
- скласці спіс кавалераў ордэнаў Рэчы Паспалітай з Вялікага княства Літоўскага і разгледзець дынаміку ўзнагароджванняў ордэнамі краіны беларускіх шляхціцаў;
- вызначыць ступень уплыву на сістэму ўзнагарод сацыяльна-палітычных працэсаў;
- раскрыць сацыяльна-палітычны характар сістэмы ўзнагарод.

Пад сістэмай узнагарод намі разумеецца сукупнасць ганаровых адзнак, а не комплекс любых узнагарод. Такая пазіцыя тлумачыцца ўсталяванымі падыходамі да гэтага пытання ў фалерыстыцы. Паняцце ж «ганаровая адзнака», на думку вядомага даследчыка В.Буркова, якой прытрымліваемся і мы, уключае ў сябе, перш за ўсё, паняцці «ордэн» і «медаль»[1]. Сінонімам гэтых тэрмінаў у спецыяльнай літаратуры выступае тэрмін «фалеронім», якім мы карыстаемся ў даследаванні.

Аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ектам даследавання з'яўляецца сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай. Прадметам – сувязі сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай з сацыяльна-палітычнымі працэсамі, што адбываліся на Беларусі ў XVIII ст. Пад такога роду сувязямі разумееца ўся сукупнасць уплываў, дачыненняў, залежнасцяў паміж ганаровымі адзнакамі і рознымі

[1] Бурков В.Г. Фалеристика.- Ленинград, 1985.- С. 15.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



праявамі сацыяльна-палітычнага жыцця. Гэта адлюстроўваецца ў такіх з'явах, як сацыяльны статус асоб, што былі ўзнагароджаны, доля пэўных катэгорый шляхціцаў сярод кавалераў ордэнаў, практыка і тэндэнцыі наданняў адзнак і г.д.

Аўтар абмяжоўвае рамкі даследавання XVIII ст. Такі падыход абумоўлены часам існавання саміх ганаровых адзнак федэратыўнай дзяржавы. Першая сапраўдная ўзнагарода тут узнікла ў пачатку гэтага стагоддзя. З гэтага часу мэтазгодна разглядаць узаемасувязі сістэмы ўзнагарод з працэсамі ў грамадстве і дзяржаве як усёй краіны, так і яе часткі – Беларусі. Але дзеля разумення адносін шляхецтва Рэчы Паспалітай да ідэі ганаровых адзнак у XVII – першай палове XVIII ст. мы характарызуем спробу заснавання ордэна Бязгрэшнага Зачацця Дзевы Марыі, якая была зроблена падчас праўлення Ўладзіслава Вазы.

Унутраная храналогія абумоўлена адрозненнем у становішчы сістэмы ўзнагарод краіны ў «саскі» перыяд і ў час праўлення Станіслава-Аўгуста.

Метадалогія і метады даследавання. Тэарытычнай асновай дысертацыі з'яўляюцца навуковыя прынцыпы даследавання: гістарызм, аб'ектыўнасць, сістэмнасць у вывучэнні гістарычных матэрыялаў.

Выбар метадаў даследавання вызначаны крыніцазнаўчай базай працы. Дзеля рэалізацыі пастаўленых мэты і задач выкарыстоўваўся шэраг метадаў гістарычнага даследавання. Сярод іх: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, статыстычны, рэканструкцыя цэлага па яго частках. Гэта дазволіла ўсебакова прааналізаваць сістэму ўзнагарод Рэчы Паспалітай і сувязі яе з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі ў XVIII ст.

Навуковая навізна дысертацыі. Дадзеная дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі спецыяльным даследаваннем дзяржаўнай сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай і яе сувязяў з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі.

З другога боку, навуковая навізна дысертацыйнага даследавання выяўляецца ў самім падыходзе аўтара да тэмы. Сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай успрымаецца намі як асобны феномен, які належаў і да здабыткаў культуры беларускага народа, а не толькі польскага, як гэта прынята ў замежнай гістарыяграфіі. У дысертацыі праз прызму вышэйшых ганаровых адзнак робіцца спроба прааналізаваць ролю і месца беларускай шляхты ў сацыяльна-палітычных працэсах усёй краіны. Зыходзячы з вывучэння розных крыніц, аўтарам упершыню складзены спіс кавалераў ордэнаў Белага Арла і св.Станіслава з Вялікага княства Літоўскага.

Большасць матэрыялаў, якія выкарастаныя для вывучэння абранай праблемы, упершыню даследуюцца ў айчыннай гістарыяграфіі. Увядзенне іх у навуковы ўжытак мае важнае значэнне, бо дазволіць выкарыстоўваць гэтыя матэрыялы не толькі пры даследаванні разглядаемай тэмы, але і пры

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



вывучэнні іншых аспектаў сацыяльнай і палітычнай гісторыі Беларусі XVIIIст.

Практычная значнасць вынікаў даследавання. Высновы, новы фактычны матэрыял дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні як спецыяльных, так і абагульняючых прац па гісторыі Беларусі адпаведнага перыяду.

Матэрыялы, абагульненні і вынікі даследавання маюць вялікую значнасць для развіцця фалерыстыкі Беларусі – адной са спецыяльных гістарычных дысцыплін, бо дазваляюць ахарактаразаваць адзін са значных перыядаў існавання ўзнагарод на Беларусі.

Некаторыя высновы, а таксама фактычны матэрыял, якія змешчаны ў даследаванні, могуць быць выкарастаны пры вырашэнні праблем, звязаных з сучасным станам сістэмы ўзнагарод Рэспублікі Беларусь. (Напрыклад, пры заснаванні новых адзнак, пры складанні статутаў, пры распрацоўцы выгляду дзяржаўных ордэнаў і медалёў і г. д.).

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:

1. Сацыяльна-палітычныя ўмовы ў Рэчы Паспалітай, пры якіх дзяржаўны лад набліжаўся да шляхецкай рэспублікі, абумовілі пазнейшае за іншыя краіны Еўропы фарміраванне дзяржаўнай сістэмы ўзнагарод.

2. Заснаванне першай ганаровай адзнакі федэратыўнай краіны – ордэна Белага Арла – стала магчымым дзякуючы абсалютысцкай палітыцы Аўгуста II і экстрэмальнай сітуацыі, што склалася на пачатку XVIII ст. падчас Паўночнай і грамадзянскай войнаў на тэрыторыі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага.

3. Фарміраванне сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай звязана са зменамі ў сацыяльна-палітычным становішчы краіны ў другой палове XVIIIст., з прарэфарматарскай дзейнасцю ўладаў. Пра гэта сведчыць усталяванне шэрага ўзнагародных медалёў, якімі адзначалі за поспехі і дасягненні ў культуры, мастацтве, навуцы і рамястве (г. зн. за грамадзянскія заслугі), што было новым для краін Еўропы; а таксама заснаванне ордэна Virtuti Militari («За ваенныя заслугі»).

4. Дынаміка адзначэнняў ордэнамі федэратыўнай краіны на працягу існавання сістэмы ўзнагарод мае значную розніцу ў першай і другой паловах XVIII ст., як колькасную, так і якасную, і абумоўлена сацыяльна-палітычнымі ўмовамі, што існавалі ў Рэчы Паспалітай у разглядаемыя перыяды. Вынікамі гэтых працэсаў падчас праўлення Станіслава-Аўгуста сталі:

- эвалюцыя адносін саміх улад да ўзнагарод: ад інструмента перш за ўсё знешняй палітыкі – пры праўленні Аўгуста II і Аўгуста III да дзейснага элемента ўнутранай палітыкі з 60-80-ых гг. XVIII ст., асабліва падчас дзейнасці Чатырохгадовага сойма;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



• трансфармацыя дзяржаўнай, палітычнай і вайсковай эліты ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай, калі на змену прадстаўнікам магнатэрыі прыходзяць выхадцы з больш шырокіх слаёў шляхты;

• змяненне стаўлення шляхты краіны (у тым ліку і беларускай) да вышэйшых адзнак – ад стрыманага ў «саскі» перыяд, да «ордэнаманіі» – у часы праўлення Станіслава-Аўгуста.

5. Доля беларускіх шляхціцаў сярод узнагароджаных ордэнамі Рэчы Паспалітай на працягу XVIII ст. залежала ад месца і ролі іх у канкрэтных сацыяльна-палітычных працэсах, але ж у цэлым адпавядала агульнаму становішчу сярод прывілейнага саслоўя краіны.

<u>Асабісты ўклад суіскальніка.</u> Увесь аб'ём даследавання выкананы самастойна. Аўтарам вывучаны, сістэматызаваны і прааналізаваны вялікі фактычны матэрыял і навуковыя працы айчынных і замежных аўтараў.

<u>Апрабацыя вынікаў дысертацыі.</u> Асноўныя пытанні дысертацыі неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі і метадычным аб'яднанні гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Асобныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання выкладзеныя на I канферынцыі «Генеалогія, геральдыка і гісторыя беларускай шляхты» (Мінск, май 1999 г.).

<u>Публікацыя вынікаў.</u> Асноўныя палажэнні, фактычны матэрыял, абагульненні і вынікі, што змешчаны ў дысертацыі апублікаваны ў адной манаграфіі, пяці артыкулах у навуковых часопісах і зборніках навуковых прац Беларусі, а таксама ў чатырох артыкулах літоўскага гістарычнага штотыднёвіка «VORUTA» з агульнай колькасцю 114 старонак.

<u>Структура і аб'ём дысертацыі.</u> Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры (уключае 232 найменняў) і 17 дадаткаў. Агульны аб'ём работы – 181 старонка, з якіх 11 старонак займае спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры, а 59 – дадаткі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



6. Прадстаўнікі беларускай шляхты як частка палітычнай эліты Вялікага княства Літоўскага мелі значны ўплыў на сацыяльна-палітычныя працэсы, што адбываліся ў Рэчы Паспалітай. Яны займалі адну з вядучых роляў у знешняй і ўнутранай палітыцы краіны. Сведчаннем гэтага з'яўляецца доля беларускай шляхты сярод усіх кавалераў ордэнаў Белага Арла і св.Станіслава, якая складае недзе па 20 % [1, 3].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ АЎТАРА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

1. Сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай.- Мінск: БДПУ, 1998.- 70 с.

2. Ордэны Рэчы Паспалітай // Беларускі гістарычны часопіс.- 1994.- №2.- С. 87-92.

3. Кавалеры ордэнаў Рэчы Паспалітай з Вялікага княства Літоўскага // Беларускі гістарычны часопіс.- 1998.- № 3.- С. 66-74.

4. Пачатковы перыяд фарміравання сістэмы ўзнагарод Рэчы Паспалітай // Весці БДПУ.- 1998.- № 3.- С. 74-79.

5. Узнагароды Рэчы Паспалітай // Пытанні гісторыі Беларусі: Зборнік навуковых артыкулаў.- Мінск: БДПУ, 1998.- С. 17-26.

6. Узнагароды Рэчы Паспалітай: гістарыяграфія праблемы // Пытанні гісторыі, метадалогіі і методыкі выкладання: Зборнік навуковых артыкулаў. Выпуск першы.- Мінск: БДПУ, 1998.- С. 32-40.

7. Baltojo erelio ordinas // Voruta.- 1994.- № 4.- P. 9.

8. Ordinas Virtuti Militari // Voruta.- 1994.- № 19.- P.6.

9. Sv. Stanislavo ordinas // Voruta.- 1994.- № 6.- P. 5.

10. Svs. Mariojos Nekalto Prasidejimo ordinas // Voruta.- 1994.- № 2.- P.5

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


# РЭЗЮМЭ

Карпіевіч Дзмітрый Віктаравіч. Сістэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай і яе сувязь з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі ў XVIII стагоддзі.

Ключавыя словы: узнагарода, ордэн, кавалер, медаль, ганаровая адзнака, сістэма, шляхціц, статут, саслоўе, Беларусь, Рэч Паспалітая, Вялікае княства Літоўскае.

Дысертацыя прысвечана даследаванню гісторыі існавання ганаровых адзнак Рэчы Паспалітай. Аўтар на падставе шырокага кола крыніц з выкарыстаннем гісторыка-параўнальнага, гісторыка-генетычнага, статыстычнага метадаў, рэканструкцыі цэлага па яго частках аналізуе працэс фарміравання і развіцця дзяржаўнай сістэмы ўзнагарод, раскрывае яе сувязі з сацыяльна-палітычнымі працэсамі на Беларусі ў XVIII ст.

У дысертацыі ўпершыню праз прызму вышэйшых ганаровых адзнак аналізуецца роля і месца беларускай шляхты ў сацыяльна-палітычных працэсах усёй краіны. Зыходзячы з вынікаў вывучэння розных крыніц, аўтарам упершыню складзены спіс кавалераў ордэнаў Белага Арла і св.Станіслава з Вялікага княства Літоўскага.

Матэрыялы і высновы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры напісанні як спецыяльных, так і абагульняючых прац па гісторыі Беларусі XVIII ст., для выкладання лекцыйных курсаў і правядзення семінараў па айчыннай гісторыі і фалерыстыцы Беларусі адпаведнага перыяду.

Палажэнні, а таксама фактычны матэрыял, якія змешчаны ў даследаванні, могуць таксама выкарыстоўвацца пры вырашэнні праблем, звязаных з сучасным развіццём сістэмы ўзнагарод Рэспублікі Беларусь. (Напрыклад, пры заснаванні новых адзнак, пры складанні ўзнагароднага заканадаўства, пры распрацоўцы выгляду дзяржаўных ордэнаў і медалёў).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЕЗЮМЕ

Карпиевич Дмитрий Викторович. Наградная система Речи Посполитой и её связь с социально-политическими процессами на Беларуси в XVIII веке.

Ключевые слова: награда, орден, кавалер, медаль, знак отличия, система, шляхтич, устав, сословие, Беларусь, Речь Посполитая, Великое княжество Литовское.

Диссертация посвящена исследованию истории существования знаков отличия Речи Посполитой. Автор на основании широкого круга источников с использованием историко-сравнительного, историко-генетического, статистического методов, реконструкции целого по его частям анализирует процесс формирования и развития государственной наградной системы, раскрывает её связи с социально-политическими процессами на Беларуси в XVIII веке.

В диссертации впервые через призму высших знаков отличия анализируется роль и место белорусской шляхты в социально-политических процессах всей страны. Исходя из результатов изучения разных источников, автором впервые составлен список кавалеров орденов Белого Орла и св.Станислава из Великого княжества Литовского.

Материалы и выводы диссертации могут использоваться при написании как специальных, так и обобщающих работ по истории Беларуси XVIII в., для чтения лекций и проведения семинаров по отечественной истории и фалеристике Беларуси соответствующего периода.

Положения и фактический материал исследования могут также использоваться при решении проблем, связанных с современным развитием наградной системы Республики Беларусь. (Например, при введении новых наград, при составлении наградного законодательства, при разработке изображения государственных орденов и медалей).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## SUMMARY

Karpievich Dzmitry Victaravich. The system of awards of Rzecz Pospolita and its connection to social-political processes in Belarus in XVIII century.

The key words: award, decoration, cavalier, medal, badge of merit, system, nobleman, statute, estate, Belarus, Rzecz Pospolita, Grand Duchy of Lithuania.

The thesis is devoted to the research of the history of existence of Rzecz Pospolita badges of merit. On the basis of a great number of sources and usage of historical-comparative, historical-genetic, statistic methods and reconstruction of the unit out of its components, the author analyses the process of state award system formation and development, discovers its connections with social-political processes in Belarus in XVIII century.

In the thesis the author for the first time makes an attempt to analyze the role and the place of Belarusian noblesse in the social-political processes of the whole country through the focus of the highest badges of merit. After studying different sources, the author for the first time has compiled the list of the cavaliers from the Grand Duchy of Lithuania awarded by the White Eagle and the St.Stanislav decorations.

The materials and conclusions of the thesis can be used for writing both special and resumptive papers on the history of Belarus XVIII century, for reading lectures and at seminars devoted to the domestic history and faleristics of Belarus of the corresponding period.

The ideas and fact-based material may be used for solving problems connected to modern development of the awards system of the Republic of Belarus. (For example at introducing new awards, constituting award legislation, designing the delineation of state decorations and medals).

